# Надзвычайная патрэба

Масква выдала прысуд сьмерці нашаму народу і ўсімі спосабамі імкнецца яго ўжыцьцёвіць. Падставаю да гэтага ёй служа каляніяльнае палажэньне Беларусі, ператворанае Масквою ў стан найгоршае няволі. Пры такім стане Масква адабрала беспасярэдня сабе ад народу нашага добрую трайціну нацыянальнае тэрыторыі ягонай і забараніла нат менаваць яе беларускай. Іншымі часьцямі нашае зямлі падаравала нашых суседзяў. Масква нішча народ наш голадам а галадоўю, нішча высыланьнем на чужыну (на Сібір, у Казахстан і інш.), нішча так званым асушаньнем Палесься, абарачаючы яго ў пескавую пустыню, нішча арыштамі, турмамі й нячуванай у сьвеце нявольніцкаю работаю ў канцэнтрацыйных табарах, нішча й беспасярэднімі забіўствамі.

Побач з гэтым, Масква тарнуе й іншыя спосабы, каб ужыцьцёвіць свой ганебны прысуд. Імі ёсьць нішчэньне нашае мовы, русыфікацыя яе і хвальшаваньне гісторыі нашага народу. Гістарычныя назовы нашых местаў адмяняе на расейскія або хоцьбы іншыя чужыя, абы толькі ня былі нашы, беларускія. Менск ужо „Мінск“, Вільня — „Вільнюс“, Горадзен — „Гродна“, Берасьце — „Брэст“, Наваградак — „Навагрудак“, Парэчча — „Дзямідаў“, Ігуменьне — „Чэрвень“ і шмат, шмат іншых. Народу нашаму забаронена зваць свае месты іхным запраўдным назовам. Ні ў воднай іншай сваёй „рэспубліцы“ Маскалі ня робяць таго, што ў нас.

Мову нашую нішчаць фактычным яе забаронам у школах і прынародных месцах (назовы вуліцаў, урадаў і інш.), спабылі яе ўрадавага ўжываньня. Псуюць нашу мову, русыфікуюць яе маскоўскімі яе „рэформамі“ і русыфікацыйнымі слоўнікамі.

У Беларусі, у тым ліку ў БССР, забаранілі выдаваць часапісы дзеля дасьледваньня мовы нашага народу і ягонай гісторыі. Бязь іх пад сыстэматычнаю русыфікацыяю мовы й хвальшаваньнем гісторыі нашыя людзі проста задыхаюцца ў сябе на Бацькаўшчыне. Ні ў чым іншым, але ў дасьледваньні мовы й гісторыі свайго народу, мы, эміграцыя беларуская, можам змагацца з Масквою і памагчы нашым братом у Бацькаўшчыне. Учыніць гэта можам, выдаючы часапіс, пасьвячаны дасьледваньню беларускае мовы й гісторыі Беларусі. Такі часапіс надзвычайна патрэбны, як хлеб. Болей: ён патрэбны, як хлеб галоднаму ў галадоўку. Сорам і ганьба будзе нам, калі мы гэтага ня ўчынім!



# Як правільна гаварыць і пісаць пабеларуску

### ПАСТАНОВЫ ЗБОРКАЎ ЧЫСЬЦІНІ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ

**Да Беларускае Інтэлігенцыі**

*(Перадмова да першага выданьня)*

Усе культурныя народы рупяцца аб чысьціні роднае мовы і працуюць дзеля гэтага ў вадумысловых установах ды выдаючы часапісы, пасьвячоныя чысьціні свае мовы.

Беларусам балей чымся якому іншаму народу трэба праца над чысьцінёй роднае мовы. Належым да народаў, што палітычна й культурна ўпалі і цяпер адраджаюцца. У часе ўпадку беларускага народу на мову нашую йшоў і цяперака йдзе ўплыў моваў суседніх, галоўна моваў тых народаў, што над намі запанавалі. Менаваны ўплыў ёсьць вельмі балючай зьяваю ў жыцьцю беларускага народу.

Дык ці не вялікай патрэбаю сталася праца над роднай мовою, галоўна дзеля яе чысьціні? Трэба не дапусьціць да дальшага засьмячэньня беларускае мовы чужымі ўплывамі і ачысьціць ад засьмячэньня дагэтулешняга. Пачаткі зборнае працы ўжо зроблены. У 1935 годзе паўсталі сыстэматычныя зборкі дзеля чысьціні беларускае мовы. Учасьнікамі зборкаў ёсьць беларускія языкаведнікі, філёлёгі, пісьменьнікі, поэты, рэдактары, публіцыстыя, — наагул усе тыя, што пішуць і друкуюць пабеларуску і тым самым уплываюць на беларускі літаратурны язык. На зборках разглядаюцца розныя пытаньні зь беларускае граматыкі й слоўніка і прыймаюцца пастановы, зь іх аднагалосныя ўсіх забавязуюць, а прынятыя бальшынёй ¾ галасоў лічацца пажаданымі. Пропозыцыі, што не дасталі ¾ галасоў, адкідаюцца. Вышменаваны склад Зборкаў Чысьціні Беларускае Мовы важны з навуковага гледзішча і дае магчымасьць шырокага выкарыстаньня практычнага прыйманых пастановаў.

Зварочуемся да ўсяе Беларускае Інтэлігенцыі з гарачым заклікам паддзержыць нашую працу. Заклікаем пашыраць пастановы Зборкаў Чысьціні Беларускае Мовы і тарнаваць іх у сваёй гутарцы і на пісьме.